***Валянціна Новак***

# ТРАДЫЦЫІ КАЛЯДНА-НАВАГОДНІХ СВЯТКАВАННЯЎ НА СТОЛІНШЧЫНЕ

У сістэме калядна-навагодняй абраднасці Столінскага раёна важнае месца адводзілася абходным шэсцям калядоўшчыкаў, абраду ваджэння казы (каня), святкаванню абрадавай вячэры – куцці, рытуалу заклікання марозу, варажбе, прыкметам і павер'ям, выкананню зімовых песень. Напярэдадні святкавання Першай або Вялікай куцці абавязкова прыбіралі ў хаце. Як адзначыла жыхарка в. Рубель Ніна Іванаўна Уцякалка, 1943 г. н., «*вельмі чысто прыбіралі хату. Обязацельно вешалі чыстые фіранкі, ручнікі, манялі посцелю. Готовілі чысту адзежу на ўсю сем'ю. Печ і грубу балілі, а после обеду хазяйка роспальвала печ і варыла яду до вачэры». Абрад калядавання (шчадравання) выконвалі, пачынаючы з другога дня святкавання Ражаства: «А на другі дзень, як прыходзілі з цэркви, садзіліса обедаць і елі не посную еду. А ўвэчары шчодравалі:*

*А ў Бога, у Бога*
*Волы рогаты*
*Пошлі ораці.*
*Маці Прэчыста*
*Обед носіла,*
*Бога просіла:*
*«Зародзі, Божэ,*
*Жыто, пшэніцу,*
*Усяку ярыцу,*
*Тобе, дзядзе, колосок,*
*А мне сала кусок,*
*Грошэй мэшок»* [*1].

Паводле сведчанняў мясцовых жыхароў, у в. Рубель хадзілі шчадраваць дзеці («*Дзеці сновалі з хаты ў хату і сповалі песні, а за гэты спеў палучалі подаркі: сало, блінцэ, бульбу, зерната*»), і моладзь. Адзначым, што вылучаліся асобныя гурты дзяўчат і хлопцаў, кіравалі якімі адпаведна жанчына і мужчына («*Дзеўкі ходзілі з жончынай, яка добрэ знала абра-*

*ды. А хлопцы ходзілі з мужчынай»*). Зыходзячы з успамінаў інфармантаў, у гэтай вёсцы шчадравалі не толькі з казой, але і з мядзведзем (*«Шчэ мое бацькі казалі, шчо коліся водзілі і мадвэдзя»* [*1]. Збіральнік-даследчык беларускага фальклору, ураджэнец Столінскага раёна В. Ліцьвінка адзначыў, што самабытнай асаблівасцю фальклору Століншчыны «з'яўляецца шчадраванне з Кабылкай, Конікам. Спрадвечным цэнтрам гэтага дзейства з'яўляецца Давыд-Гарадок, дзе яно праходзіць прыгожым святам:

*Ой, там пуд шчодром Василько з конём,*
*Ой, грай, морэ, радуйся зэмле!*
*На коні сэдзіць, дудочку дэржыць.*
*Ў дудочку йграе, слічно спэвае.*
*Прышла до ёго матонька ёго.*
*– Ой, сынку, сынку, хто ж тэбэ вучыў?*
*– Хто ж тэбэ вучыў ў дудочку йграці?*
*– Ў дудочку йграці, слічно спэваці?*
*– Була ў короля одыня дочка.*
*– Вона наўчыла ў дудочку йграці,*
*Ў дудочку йграці, слічно спэваці»* [3, *580–581*].

Паводле сведчанняў жыхароў Давыд-Гарадка, у іх мясцовасці абрад калядавання называецца «Конікі». У складзе каляднай світы былі пераапранутыя ў розныя маскі: «*А наўкола – Дзед Мароз, Снягурачка, чэрці, Баба Яга, шэры воўк, мядзведзь, бараны, каровы і нават Смерць з касою, бусел, цыганкі і мешчанкі ў сваіх уборах*» [*2]. Калядоўшчыкі, наведваючы падвор'і аднавяскоўцаў, звярталіся да гаспадароў з наступнымі прыгаворамі:

*Жадаем табе, чалавеча,*
*Поўную адрыну авечак!*
*Жадаем вам бочку ярыцы,*
*Рэшата аўса, наверх калбаса,*
*Тры кілаграма сала,*
*Хаці і гэтага мала.*
*А галоўнае, каб дзеткі*
*Былі сыты і абуты,*
*Здаровы і багаты!* [*2].

У чацвёртым томе выдання «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» адзначана, што «мікралакальную традыцыю, уласцівую толькі г. п. Давыд-Гарадок Столінскага раёна, складаў абход з удзелам пераапранутых – «конікаў» [4, *26*]. Заслугоўвае ўвагі наступны тэзіс даследчыкаў: «Маска-персанаж «К.» («кабыла», «кабылка», «конь») выяўлена ў 1980 г. у час

фальклорнай экспедыцыі пад кіраўніцтвам Ю. Чурко ў в. Вялікія Арлы Столінскага раёна» [1, *591*]. Фальклорна-этнаграфічны матэрыял, запісаны выкладчыкамі і студэнтамі УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны» падчас летняй палявой экспедыцыі 2016 г., праведзенай на тэрыторыі Столінскага раёна, дае падставы сцвярджаць, што вышэйназваная калядная абрадавая з'ява «конікі» была характэрна і для фальклору многіх вёсак Століншчыны. Напрыклад, як адзначылі жыхары в. Белавуша, «*когда-то ў нас быў конік, козы – у нашай дзерэвне такога обычая не було. Одзевалі спецыяльно, з мацерыялу шылі одзежду, дзелалі дзеравянную такую дугу, і чоловек заходзіў туда, і дзелалі под коніка*» [*3]. Як адзначылі жыхары в. Атвержычы, калі ішлі калядаваць, то гаварылі: «*Пойдам заўтра ў конікі*» [*4]. Аднаго з удзельнікаў каляднай світы («салдата з плёткай») называлі «забягайло»: «*Пераапраналіся ў салдатаў, былі яшчэ казакі. Вельмі інцерэсно было тое, што яны былі так апрануты: с плеццю такой вон ідзе, кросота была*» [*4].

Падчас калядавання-шчадравання ў в. Манькавічы выконвалі абрад ваджэння «коніка»: «*Ходзілі человек может восем. Собіралісь за недзелю да старога Новага году. Я быў як казак: брукі офіцэрскія, лампасы красныя, шапку строіл. Быў дзед з бородой, яго так адзевалі. Была баба з мяшком, хадзіла з торбаю ды туды брасалі што. Коніка дзелалі со звоночком, і мужык сядзеў на ём. Гармонь была і бубен. Пяць казакоў нас было, калі і больш. Я, допусцім, бягу по дзерэўні з нагайкаю ( усы дзелалі ўсім), і дом адкрывалі па дзерэўні кожны. Пелі, плясалі, з старым Новым годам поздравлялі, хозяева ўжо стояць з караваем, слухаюць*» [*5]; «*Коніка водзілі: голову коня робяць, хвоста, і на любога мужчыну, хто такі справны, і ўжо ў хаты ўлазяць. Гэты конь ды гуляе, хвастом махае, скача. Гормошка грае*» [*6].

У в. Струга ў абрадзе калядавання, які быў вядомы пад назвай «хадзіць у Каляду», таксама рабілі маску каня: «*Жанчына дзелала во такого коня, сама рабілася мужыком такім, козаком рабілася, а я цыганкою була. Мы хадзілі по дзерэўне самі, по хатах, проста спявалі:*

*Добры вечар тому, добры вечар тому,*
*Хто ў этому дому, хто ў этому дому.*
*Столы накрывайце, столы накрывайце,*
*Кубкі налівайце, кубкі налівайце.*
*Святые Рождэство, святые Рождэство*
*Всем радосць прынесло, радосць прынесло*» [*7].

Іншыя жыхары гэтай вёскі пацвердзілі, што абраду ваджэння казы ў іх мясцовасці не было: «*У нас не водзілі козу. Это там у другой дзярэўні, то тыя водзілі козу. А ў нас так ходзілі, з звіздою*» [*8]. Паводле сведчанняў

Любові Аляксандраўны Ліцвінка, 1934 г. н., у в. Струга вадзілі каня: «*Робілі хлопцы коня. Робяць коня, бярэ нопхае соломой, ногі так попрышываюць, з матэр'ялу голову зробяць і вось гэту ўздэчку зробяць, і хвоста со льну ззаду прышые і скача, а хвост тое мотаецца. Это на Нові Год ходзілі так*».

Паводле ўспамінаў жыхароў г. Столін, «*вадзілі ў нас каня і пелі всякія песні духоўныя, абы-якія не пелі, толькі колядные:*

*Ой, на Рождзество*
*Ангел прілецел.*
*Он лецел по небу,*
*Людзям песні пел:*
*– Все людзі, лікуйце,*
*В сей дзень торжэствуйце –*
*В дзень Хрыстово Рожэство!*
*Я лечу от Бога,*
*Радосць вам прынёс,*
*Што в пешчэрэ цёмнай*
*Родзілся Хрыстос.*
*Скарэй поспяшайце,*
*Младзенца вітайце*
*Нованарождзенова*» [*9].

У в. Белавуша, калі хадзілі калядаваць, то ўдзельнічала некалькі гуртоў калядоўшчыкаў: «*На Калядкі ўсе ходзяць: і дзеці, і старыя ходзяць. Раньше с конікамі ходзілі, а зараз не*» [*10]. Апошняе сведчанне інфарманта і іншыя фальклорна-этнаграфічныя запісы даюць падставы сцвярджаць, што актыўнасць бытавання традыцыі калядавання з канём паступова згасае, але ў народнай памяці звесткі пра абрад «Конікі» ўстойліва захоўваюцца. Напрыклад, паводле ўспамінаў Хрысціны Аляксандраўны Белавус, 1934 г. н., з в. Малыя Вікаравічы, «*ходзіў гурт на шчодрыкі, уваходзілі ў хату. Хлопцы ходзілі, дзяўчаты тожэ ходзілі ў хату і «шчодрыца» співаюць і вячэраюць. Робляного з дзерава коня водзілі. І косы такія прычэпленыя да каня былі. Ды як пойдуць з тым канём гуляць па хаце!*»

Паводле ўспамінаў жыхароў в. Струга, у іх мясцовасці, калі калядавалі, то насілі зорку: «*На Каляды жанкі хадзілі, обычно звезду робяць і так могуць перадзецца. Самая галоўная – звезда, як што, так сімвал – звезда*» [*11]. Калядоўшчыкі хадзілі з зоркай і на Ражаство, і на Новы год: «*Звэзду і на Новы год, і на Роздво носілі, у нас учінікі носілі звэзду*» [*12].

Падрыхтоўка куцці з'яўлялася важным момантам у сістэме каляднанавагодніх святкаванняў. Як і ў іншых мясцовасцях Беларусі, на Століншчыне адзначалі Першую («*Посная была куцця эта пэрад Рождзеством*»), Другую («*А тады была пэрад Новым годам. Эта ужэ была ба-*

-

*гата куцця*») і Трэцюю куццю («*Крэшчэнска куцця – это тожэ была посная*») [*13].

Калі адзначалі Першую куццю, то, як і ў іншых мясцовасцях Беларусі, абавязкова клалі сена на стол, які потым засцілалі абрусам, тлумачачы гэта тым, што «*Хрыстос родзіўся на сене. Сено ложылі под скацерць, і яно ляжало до Раждэжаства Хрыстова*» [*3]. У сістэме калядна-навагодніх святкаванняў Століншчыны важнае месца адводзілася рытуалу заклікання марозу, які выконвалі ў розных вёсках або на Першую куццю, або на Другую, або на Трэцюю. Напрыклад, у в. Струга выкананне рытуала заклікання марозу было звязана са святкаваннем Першай куцці: «*Перод Роцтвом открыют вокно і ўжо і завуць: «Мороз, мороз, хадзі куццю есці! Не морозь ні цялят, ні ягнят!*» [*7]; «*Мороз,мороз, ходзі куццю есці, да не йдзі на худобку і й на нас*» [*12]. Зварот да марозу асэнсоўваецца як імкненне жыхароў забяспечыць сабе ў будучым у працы на ніве і ў гаспадарцы падтрымку духаў продкаў, якіх сімвалічна і замяняў гэты вобраз. Жыхары Століна запрашалі на Першую посную куццю «*всіх святых, всіх свяцітелей. Як содзяцца за куццю, моляцца, молітву «Отчэ наш» чытаюць і прызываюць всіх святых, всіх волхвов*» [*9]. Іншы раз звярталіся непасрэдна да нябожчыкаў, заклікаючы іх на калядную вячэру: «*На куццю дзядоў зовуць. Это ж покойніков завсегда зовуць вечэраць*» [*14].

У в. Струга, калі рыхтаваліся адзначаць багатую куццю, то абавязкова пад абрус клалі звязаныя каласкі жыта, што, зыходзячы з народных вераванняў, павінна было забяспечыць ураджайнасць нівы: «*Штоб быў багаты год, штоб уражайны, клала каласкі такія звязаныя несколько под абрус*» [*15]. У мясцовай каляднай традыцыі в. Струга менавіта на Другую куццю, каб куры несліся дома, паміж гаспадыняй і кім-небудзь з суседзяў адбываўся наступны дыялог: «*На гэту куццю прыходзіць ужо суседка і пытае:*

*А дзе твое куры нясуцца?*
*Кажам:*
*Дома!*
*Іна кажа:*
*Весь год будуць дома несціся*» [*16].

Падчас святкавання Другой куцці ў в. Глінка таксама меў месца аналагічны дыялог: «*Другая куцця ўжо була скоромна. ... У гэты вечор, калі содыліса вячэроты, то выходзіць, допусцім, хазяйка з хаты і будэ іці ў хату: «Добры вечор! А дэ будут нашы куры нэсцыса?» – А другі адказаў: «У своіх хлявах, каб ні до кого не йшлі*» [*17]. З прыведзеных звестак вынікае відавочная скіраванасць дыялогу, звязанага з магіяй слова, на тое, каб паспрыяць станоўчаму вырашэнню пытання – у дадзеным выпадку каб куры несліся на ўласным падворку. З Другой куццёй у в. Бережное быў

звязаны рытуал падвязвання пладовых дрэў, што, па народных уяўленнях, павінна было паспрыяць ураджайнасці садавіны: «*До вэчоры (Другая куцця) стараліся подвязваць сад. Хто молодзейшы, ішоў пэрэвяслами падвязваць яблыні і грушы*» [*18].

З Другой куццёй была звязана шлюбная варажба, узоры якой у шматлікіх варыянтах былі запісаны ў розных вёсках Столінскага раёна. Як вынікае з фактычных матэрыялаў, найбольшую распаўсюджанасць атрымалі такія віды варажбы, як «*паланне грабянцоў у начоўках*» («*Збіраюць грэбянцы, клалі ў начоўкі і палалі: чый упэрод упадэ той грэбянэц, то тая ўпэрод замуж пойдэ*» [*19]; насыпанне зерня каля тых месц, дзе знаходзіліся дзяўчаты, і выпусканне кур («*Куру пускалі. Зерно понасыпаем возле каждой дзевчіны, до которой прыйдзе первей, та замуж ужэ выйдзе*» [*20].

Трэцюю куццю называлі «поснай» і святкавалі яе на Вадохрышча («Крэшчэнье»). Адзначым, што ў в. Сямігосцічы рытуал заклікання марозу выконвалі якраз на гэту, апошнюю куццю: «*Сеўшы за стол, хазяін уставаў, уся остальна сем'я седзела. Господар стукаў у окно: «Мороз, мороз! Ідзі куццю есці. Мороз, мороз! Не йдзі на просо, не йдзі на картоплі, а йдзі до нас на ўгошчэнье!*» [*21]. Паводле сведчанняў вышэйназваных інфармантаў, рэшткі куцці раніцай аддавалі свойскім жывёлам, «*отдавала курам, шчоб добрэ несліса, свіньям, шчоб корміліса і не дохлі, корові, хто быў у хозяйстві, шчоб худоба веласа*». У в. Бережное Трэцюю куццю называлі «Голодніца». У гэты дзень асвячалі ваду, выразалі з лёду крыж і «*облівалі его бураковым соком, потом ставілі. Стояў ён, покуль лёд на рэцэ не пойдзе*» [*18]. Як адзначылі жыхары в. Глінка, у іх мясцовасці сам момант асвячэння вады быў вядомы пад назвай «Водостоянне». У магічную сілу пасвечанай вады на Крашчэнне мясцовыя жыхары вераць і сёння: «*Святая вода од усяго помагае цэлі год. Уліваю гэту водычку, надзеюсь на Бога, шчо тая божая помошчы поможэ мне*» [*17, *19*]. Як адзначылі жыхары в. Ніжні Церабяжоў, пасвечанай вадой абавязкова «*кропімо хату (это на Крэшчэнне вода свяціцца) ... Кропімо сарая, штоб было всэ добро*» [*13]. Гэты рытуал, звязаны з апатрапеічнай і прадуцыравальнай магіяй, выконвалі ва ўсіх вёсках Століншчыны. У некаторых мясцовасцях гэтай традыцыі жыхары прытрымліваюцца і сёння.

Варажба, якая адбывалася на Крашчэнне, была звязана з аграрнай магіяй, напрыклад, варажылі на добры ўраджай ільну: «*На Хрышчэнне сено таксама ложылі на стол, потом выцягалі і глядзелі, які лён у нас будзе. Як выцягнем доўга, так і лён вырасце. Под скацерць слалі сенца*» [*22].

Што датычыць калядна-шчадроўных песень, то іх тэксты добра захаваліся ў памяці інфармантаў. Як слушна адзначыў А. С. Ліс, «калядкі і шчадроўкі – рэпрэзентатыўны раздзел класікі беларускай народна-паэтычнай культуры. Яны нарадзіліся ў ходзе непасрэдных кантактаў выканаўцаў абходнага абраду з прадстаўнікамі соцыуму» [2, *176*]. Сярод жан-

равых разнавіднасцей зімовых песень, зафіксаваных на Століншчыне, вылучаюцца «святыя» або рэлігійныя песні, якія ў экспедыцыйных запісах пераважаюць, агульнакалядныя або прадкалядныя, велічальна-віншавальныя калядныя, адрасаваныя гаспадару, дачцэ, сыну, песні-шчадроўкі, што выконвалі з 13 студзеня, і інш.

Такім чынам, калядна-навагодняя абраднасць Століншчыны, захоўваючы агульнаэтнічную аснову, вылучаецца адметнымі мясцовымі асаблівасцямі, якія яскрава выяўляюцца на ўзроўні асобных структурных кампанентаў.

## ЗАЎВАГІ

*1. Запісана ў в. Рубель ад Ніны Іванаўны Уцякалка, 1943 г. н.

*2. Запісана ў Давыд-Гарадку ад Марыі Міхайлаўны Куст, 1928 г. н.

*3. Запісана ад Мікалая Сяргеевіча Міхнаўца, 1947 г. н.

*4. Запісана ад Ганны Тарасаўны Яхнавец, 1942 г. н.

*5. Запісана ад Рыгора Паўлавіча Вандзіча, 1946 г. н.

*6. Запісана ад Кацярыны Данілаўны Панцюк, 1932 г. н.

*7. Запісана ад Пелагеі Аляксееўны Крывапост, 1934 г. н.

*8. Запісана ад Лідзіі Філіпаўны Пашкевіч, 1945 г. н.

*9. Запісана ад Вольгі Ануфрыеўны Аўсянік, 1940 г. н.

*10. Запісана ад Кацярыны Іосіфаўны Сімончык, 1932 г. н.

*11. Запісана ад Вольгі Іванаўны Мароз, 1961 г. н.

*12. Запісана ў в. Беражное ад Аляксандры Нікандраўны Германовіч, 1929 г. н.

*13. Запісана ў в. Ніжні Церабяжоў ад Веры Раманаўны Грэчка, 1936 г. н.

*14. Запісана ў в. Ніжні Церабяжоў ад Аляксандра Андрэевіча Козела, 1933 г. н.

*15. Запісана ад Валянціны Лявонаўны Мароз, 1948 г. н.

*16. Запісана ў в. Струга ад Любові Аляксандраўны Ліцвінка, 1934 г. н.

*17. Запісана ад Ірыны Гаўрылаўны Ярашэвіч, 1936 г. н.

*18. Запісана ад Алены Іванаўны Пульман, 1933 г. н.

*19. Запісана ў в. Глінка ад Надзеі Іванаўны Арсеновіч, 1949 г. н.

*20. Запісана ў в. Беражное ад Надзеі Юльянаўны Сапон, 1943 г. н.

*21. Запісана ад Уладзіміра Сцяпанавіча Андрайчука, 1917 г. н., Наталлі Сцяпанаўны Баган, 1928 г. н.

## ЛІТАРАТУРА

1. Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш]. – Мінск: БелЭн, 2005. – Т. 1: Акапэла – Куцця. – 768 с.

2. Беларусы. Т. 7. Вусная паэтычная творчасць / Г. А. Барташэвіч, Т. В. Валодзіна, А. І. Гурко [і інш]; Рэдкал.: В. М. Бялявіна [і інш]; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 586 с.

3. *Ліцьвінка, В. Дз.* Невычэрпная крыніца фальклору // Памяць. Столінскі раён. – Мінск: БЕЛТА, 2003. – 635 с.

4. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / В. І. Басько [і інш.]; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2008. – Т. 4. Брэсцкае Палессе: у 2 кн., кн. 1. – 559 с.